

# Гимн Афродите

*За длительность вот этих мигов странных,*
*За взгляд полуприкрытый глаз туманных,*
*За влажность губ, сдавивших губы мне,*
*За то, что здесь, на медленном огне,*
*В одном биеньи сердце с сердцем слито,*
*Что равный вздох связал мечту двоих, —*
*Прими мой стих,*
*Ты, Афродита!*

*За то, что в дни, когда поля, серея,*
*Покорно ждут холодных струй Борея, —*
*Твой луч, как меч, взнесенный надо мной,*
*Вновь льет в мой сад слепительность и зной,*
*Что зелень светлых Аквилонов взвита,*
*Что даль в цветах, и песни реют в них, —*
*Прими мой стих,*
*Ты, Афродита!*

*За все, что будет и не быть не может,*
*Что сон и этот будет скоро дожит,*
*Что видеть мне, в час сумрачных разлук,*
*Разомкнутым кольцо горячих рук,*
*Что тайно в страсти желчь отравы скрыта,*
*Что сводит в Ад любовь рабов своих, —*
*Прими мой стих,*
*Ты, Афродита!*

***В.Брюсов***


AiB

Заснавальнік і выдавец —
рэдакцыя часопіса
"Адукацыя і выхаванне"

*Галоўны рэдактар*
**У.П.Пархоменка**

...04, г. Мінск,
...л. Караля, 16;
...220-54-81, 220-54-10

Штоквартальны
навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842

**1 (5) 1998**


# ГІСТОРЫЯ:
## праблемы выкладання


БДПУ імя Максіма Танка
Бібліятэка ... корпус №71

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
М.І.Мініцкі
*Намеснік галоўнага рэдактара*
Н.М.Ганушчанка
*Адказны сакратар*
Р.Я.Грынкевіч

І.І.Багдановіч
С.К.Ганцова
Г.А.Космач
У.С.Кошалеў
У.М.Міхнюк
С.В.Паноў
В.В.Сакалова
М.С.Сташкевіч
К.І.Сякацкая
У.В.Тугай
В.М.Фамін
В.М.Шутава
А.А.Яноўскі

*Мікалай Мініцкі,*
*галоўны рэдактар часопіса*

# Слова да чытача

Прайшоў год з часу заснавання часопіса. Ужо можна падсумоўваць асобныя здабыткі. Перш за ўсё мы мяркуем, што галоўны накірунак — ісці па шляху аднаўлення зместу і пошуку новых методык — вытрымліваўся. У кожным нумары мы імкнуліся даць матэрыял, карысны для выкладчыцкай справы і для самаадукацыі. Рэдакцыйныя арыенціры, акрэсленыя ў першым нумары, у асноўным супадалі з аўтарскімі намерамі. Разам з тым ужо зараз можна бачыць магчымасць удасканалення як зместу, так і структуры часопіса.

Зыходзячы з патрабаванняў сучаснай сістэмы адукацыі, неабходна больш дакладна вызначыць высновы ў выкладанні гісторыі: абнаўлення зместу і ўдасканаленне методыкі. Цяпер значнай увагі патрабуе пытанне, як вывучаць гісторыю. Гэта аднак не азначае, што перасталі быць актуальнымі пытанні зместу і мэтаў гістарычнай адукацыі. Адсюль некаторыя змены ў структуры часопіса — удакладняюцца яго рубрыкі. Аднак вызначаныя ў першым нумары накірункі, захоўваюцца.

Пэўнай заваёвай выдання стала спалучэнне тэарэтычнай думкі даследчыкаў і абагульненага настаўніцкага вопыту. Але ў гэтым напрамку зроблены толькі першы крок і больш мэтазгодным было б з'яўленне сумесных распрацовак, тэарэтыкаў і практыкаў па раздзелах падручніка. Увогуле, рэдакцыя згодна аддаць перавагу на старонках часопіса настаўніцкім артыкулам. Прамая сувязь з настаўніцкай аўдыторыяй — гэта стратэгічная лінія ў існаванні часопіса. Таму мы звяртаемся за дапамогай у аддзелы адукацыі і метадычныя кабінеты, якія змаглі б дапамагчы настаўніку падрыхтаваць для рэдакцыі нейкі абагульнены вопыт. Спалучэнне індывідуальнага і калектыўнага вопыту атрымае станоўчы водгук у настаўніцкім асяроддзі.



Часопіс імкнуўся даць слова як вядомым аўтарам, так і тым, хто ўпершыню дакрануўся да даследчыцкай справы. У сэнсе адданасці "рамяству гісторыка" мы аднолькава ўдзячны кожнаму, хто імкнуўся ісці па шляху "старавечных сцежак" гісторыі.

Значнай справай у вызначэнні тэарэтычнага ўзроўню часопіса было ўсталяванне творчых сувязяў з супрацоўнікамі калектываў гістарычнага факультэта БДУ, Нацыянальнага інстытута адукацыі, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Ёсць намер і пэўныя планы ў памнажэнні такіх намаганняў.

З творчых задумак на будучыню вызначым толькі, на наш погляд, найбольш важкае. Зроблена тэарэтычнае абгрунтаванне, напісаны тэксты новых праграм па гісторыі для базавых агульнаадукацыйных школ, якія будуць прапанаваны для абмеркавання. Існуе намер змясціць у друку тэарэтычную распрацоўку ўводзін да настаўніцкага дапаможніка па гісторыі старажытнага свету (V, IX кл.). Будзе заснавана спецыяльная рубрыка па краязнаўстве, дзе знойдуць месца матэрыялы па гісторыі гарадоў Беларусі. Рэдакцыя выступіць з ініцыятывай дыскусіі на тэму "Школа, асоба і гістарычная адукацыя".

Чакаем водгукаў і прапаноў па ўдасканаленні часопіса. Глыбокая ўдзячнасць усім тым, хто падтрымаў нас і падпісаўся на часопіс, і хай не крыўдуюць тыя, каго мы чымсьці не задаволілі. Мы разлічваем на дыялог, павагу і ўзаемаразуменне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ